Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка

# Праграма
# па гісторыі славянскіх народаў

Мінск 1998

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 940 (075.8)
ББК 63.3 (4)я73
П 784

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ імя М. Танка

Зацверджана на пасяджэнні Вучонага савета гістарычнага факультэта (пратакол № 10 ад 27 мая 1998 г.)

*Складальнікі:* І.А.Груца, В.Ц.Ісаеў, А.М.Космач, Н.Д.Ляўковіч, У.С.Пуцік, В.М.Фамін, В.Р.Федарасава, У.А.Ціток, Ф.А.Шумскі

*Пад рэдакцыяй* А.П.Жытко, У.В.Тугая, В.М.Фаміна

© Калектыў складальнікаў, 1998

# Тлумачальная запіска

У сувязі з тым, што ў вучэбныя планы гістарычных факультэтаў педагагічных універсітэтаў уведзены курс "Гісторыя славянскіх народаў", выкладчыкамі кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі падрыхтавана адпаведная праграма. Складаецца яна з дзвюх частак: "Гісторыі ўсходніх славян" і "Гісторыі заходніх і паўднёвых славян".

Славянскія народы – гэта своеасаблівы, шматгранны і рознабаковы сацыяльна-гістарычны феномен. Іх гісторыю нельга разглядаць паасобна. У той жа час славянскі свет цесна звязаны з заходнееўрапейскімі ды іншымі цывілізацыямі. Менавіта таму ў праграме прадугледжана асвятленне асноўных этапаў развіцця славянскіх народаў у кантэксце сусветнай гісторыі.

Складальнікі праграмы не прытрымліваліся вузкакласавага падыходу ў тлумачэнні гістарычнага мінулага: у праграме асвятляюцца розныя гістарыяграфічныя падыходы да разгляду ключавых пытанняў гісторыі славянскіх народаў. Пры гэтым яны кіраваліся такімі прынцыпамі гістарычнага пазнання, як аб'ектыўнасць, гістарызм і каштоўнасная значнасць.

Матэрыял праграмы размеркаваны паводле сучаснай перыядызацыі:

*першы перыяд* – сярэднявечча (V – канец XV – пачатак XVI ст.);

*другі* – новы час (XVI ст. – 1917 г.);

*трэці* – навейшы час (1917–1998 гг.).

Перыяды, у сваю чаргу, маюць ключавыя раздзелы.

Праграма прызначана студэнтам гістарычных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Новы час (XVI ст. – 1918 г.)

### *Раздзел 1.* Паўднёвыя і заходнія славяне ў перыяд станаўлення і развіцця буржуазнага грамадства (XVI ст. – 1918 г.)

***Тэма 1. Паўднёваславянскія землі над уладаю Турцыі***

Турэцкая ваенна-ленная сістэма. Становішча народаў, царквы. Сялянства Балканскага паўвострава ў XV – першай палове XVI ст. Распад ваенна-леннай сістэмы. Пагаршэнне становішча сялян у другой палове XVI – першай палове XVIII ст. Нацыянальны ўціск.

***Тэма 2. Барацьба паўднёваславянскіх народаў супраць турэцкага прыгнёту***

Гайдуцкі рух. Барацьба супраць туркаў на балгарскіх і македонскіх землях. Барацьба чарнагорцаў за незалежнасць. Войны цэнтральна-еўрапейскіх дзяржаў супраць Асманскай імперыі. Утварэнне "Свяшчэннай лігі". Пажарэвацкі мір.

***Тэма 3. Харватыя пад уладаю Габсбургаў у XVI–XVIII стст.***

Абранне Фердынанда Габсбурга каралём венгра-харвацкай дзяржавы. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча харвацкіх зямель у складзе Аўстрыйскай імперыі. Барацьба супраць туркаў. Ваенная мяжа. Змова Зрынскіх. Харватыя ў XVIII ст. Рэформы Марыі-Тэрэзы, Іосіфа II.

***Тэма 4. Славенскія землі пад уладаю Габсбургаў і Венецыі (XVI–XVIII стст.)***

Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Сялянскія паўстанні ў XV ст. Рэфармацыя і каталіцкая рэакцыя. "Асветніцкі абсалютызм" у славянскіх землях. Істрыя пад уладаю Венецыі.

***Тэма 5. Культура паўднёвых славян у XVI–XVIII стст.***

Балгарская культура. М.Грамацік. Сербская культура. І.Раіч. Культурныя сувязі Сербіі і Расіі, Сербіі і Украіны. Харвацкая культура. Дуброўнік. Славенская культура.



***Тэма 6. Чэхія і Славакія пад уладаю Габсбургаў (1526–1620 гг.)***

Развіццё сельскай гаспадаркі, рамяства. Антыгабсбургская апазіцыя саслоўяў. Паўстанне 1547 г. Барацьба саслоўяў супраць Габсбургаў. Чэшская канфецыя 1575 г. Бітва каля Белай гары ў 1620 г. Славакія ў XVI ст.

***Тэма 7. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Чэхіі і Славакіі ў 1620–1781 гг.***

Чэхія ў перыяд Трыццацігадовай вайны. Земскі статут Фердынанда II (1627 г.). Выгнанне пратэстантаў. Замацаванне фальваркава-паншчыннай гаспадаркі. Паўстанне 1680 і 1775 гг. Абмежаванне феадальнай залежнасці сялян. Развіццё мануфактур. Рэформы Марыі-Тэрэзы. Становішча Славакіі ў XVII – пачатку XVIII ст.

***Тэма 8. Чэшская і Славацкая культура XVI–XVIII стст.***

Культура чэшскага Адраджэння. Я.А.Каменскі. Развіццё прыродазнаўчых навук. Зараджэнне гістарычнай навукі. Кнігадрукаванне. Чэшскі тэатр. Адукацыя, літаратура, жывапіс у Славакіі. Палітыка Габсбургаў у галіне адукацыі і культуры.

***Тэма 9. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё польскіх земляў у канцы XVI – сярэдзіне XVII ст.***

Росквіт гарадоў, рамяства, гандлю. Аграрны лад. Барацьба паміж шляхтай і магнатамі. Аслабленне каралеўскай улады. Генрых Валуа. Артыкулы 1573 г. Стэфан Баторый на польскім троне. Распаўсюджванне рэфармацыйных ідэй. Склад і асаблівасці рэфармацыйнага руху. З'езд 1570 г. у Сандаміры. Контррэфармацыя. Брэсцкая царкоўная унія. Пачатак эканамічнага застою.

***Тэма 10. Знешняя палітыка Рэчы Паспалітай у другой палове XVI – першай палове XVII ст.***

Барацьба за расійскі трон. Рэч Паспалітая ў Лівонскай вайне. Войны са Швецыяй. Нацыянальна-вызваленчая барацьба ўкраінскага казацтва пад кіраўніцтвам Багдана Хмяльніцкага.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ